Часопіс жанчын Беларусі

# АЛЕСЯ

ISSN 0131-8055

№ 12 ■ 2019

## Работніца і сялянка



АСОБА ■ ПОСПЕХ ■ ЗДАРОЎЕ ■ ПСІХАЛОГІЯ ■ СЯМ'Я ■ ДЗЕЦІ ■ ДОМ 12+

# «Алеся» приглашает




14 снежня ў гістарычным будынку Купалаўскага адбудзецца Венскі баль. Баль задуманы як дабрачынны: 50 % атрыманых сродкаў будуць накіраваны на падтрымку работы грамадскага аб'яднання «SOS-дзіцячыя вёскі Беларусь», што дапамагае сіротам і дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, знайсці новую сям'ю, а тым, хто знаходзіцца ў зоне рызыкі сацыяльнага сіроцтва, – пераадолець складаныя жыццёвыя абставіны і захаваць родную сям'ю.




Вканун Рождества 24 декабря в 18.00 под ночным небом концертного зала «Верхний город» оркестр «Минск-Классик» приглашает всех любителей популярной классической музыки окунуться в праздничную атмосферу Большого Рождественского концерта и получить море позитивных эмоций и хорошего настроения.




Выстава «Усход-Захад» – вынік творчага супрацоўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Большасць твораў мастацтва прадстаўлена на выставе ўпершыню.

Выстава працуе да 12 студзеня 2020 г. Адрас: вул. К.Маркса, 12, г. Мінск.




Упрадчуванні навагодніх святаў і зімовага цуда з 6 снежня 2019 г. у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрываецца навагодні выставачны праект «Музей ёлачных цацак». Выстава – частка збору найбуйнейшай сусветнай калекцыі ёлачных цацак. Кожны год «Музей ёлачных цацак» абнаўляе свае фонды.

Алеся
12/2019
95 РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

ШТОМЕСЯЧНЫ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС (ДЛЯ ЖАНЧЫН)

ВЫДАЕЦЦА З ЛІСТАПАДА 1924 г.
МАТЭРЫЯЛЫ ДРУКУЮЦЦА
НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ
ВЫХОДЗІЦЬ АДЗІН РАЗ НА МЕСЯЦ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь,
Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз жанчын".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 1140 ад 28.10.2014, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

ВЫДАВЕЦ:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом "Звязда"

Дырэктар – галоўны рэдактар
Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Шэф-рэдактар
Ларыса Паўлаўна РАКОЎСКАЯ

Адрас рэдакцыі
Юрыдычны адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
Тэл./факс: 8 (017) 287-19-19

Паштовы адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.
e-mail: *alesya@zviazda.by*
Сайт: *zviazda.by/be/edition/alesya.by*
Тэл.: 8 (017) 287-16-29, 287-17-59, 287-17-35

Падпісныя індэксы:
індывідуальны – 74995
ведамасны – 749952

Мастацкі рэдактар, камп'ютарная вёрстка Т. А. МАЛЬКО

Падпісана да друку 29.11.2019 г.
Фармат 60х84 $^1/_8$.
Гарнітура "Georgia".
Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 7,44.
Ул.-выд. арк. 10,0.
Тыраж 1227 экз. Зак. №

На вокладцы:
выцінанка народнага майстра Алены ШАЛІМА.

*Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.*
*Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком ®, носяць рэкламны характар.*
*Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.*

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "БудМедыяПраект",
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 г.
вул. В. Харужай, 13/61, 220123, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

12+

© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2019
© Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз жанчын", 2019

# ЧЫТАЙЦЕ






















З Новым годам! ........ 2

## ЛІДЕРЫ
**Марианна ЩЁТКИНА:** «Сегодня женщины ломают стереотипы» ........ 4

## ЮБІЛЕЙ
«Чараўніцы» – значыць прыгажуні ........ 6

## ГОСЦЯ РЭДАКЦЫІ
**Марыя ВАШКЕВІЧ.** Жоўты «Мустанг» для Марыі ........ 10
**Анхела ЭСПІНОСА РУІЗ.** «Чалавек створаны з любові і зорнага пылу...» ........ 14

## ПРАЕКТЫ
Знайдзіся, дзіця! ........ 18

## РАКУРС
Оспаривание отцовства ........ 20

## ПСИХОЛОГИЯ
Чудеса своими руками ........ 22

## СПАДЧЫНА
Сакрэты прыгажосці нашых продкаў ........ 24

## ГОСЦЯ РЭДАКЦЫІ
**Алена ШАЛІМА.** Нажніцы і папера для святочнага інтэр'ера ........ 27

## ВКУС ЖИЗНИ
**Увлечения.** Манишка-бактус ........ 31
**Дом.** Яркие детали вашего букета ........ 34
Создаём волшебное настроение! ........ 36
**Отдых.** Как не заскучать в праздничный вечер ... 38
**Традиции.** Корейский новый год ........ 41
**Здоровье.** Коррекция фигуры ........ 44
Спасаем кожу зимой ........ 48
**Здоровье.** ТОП-5 белорусских кремов для лица ........ 48
**Стиль.** Ах – Ахатины! ........ 50
**Здоровье.** Полюбите холод ........ 53
**Кухня.** Зимние варенья ........ 54

## КАЗКА
**Галіна ПШОНІК.** Амаль праўдзівая гісторыя ........ 56

## ЖЕНСКАЯ ИСТОРИЯ
**Валентина БЫСТРИМОВИЧ.** Это был Дед Мороз ........ 60

## ВАШ ГАРАСКОП

## СКАНВОРД







# З Новым годам!

Вось-вось да нас завітае свята, аднолькава доўгачаканае і любімае як дзецьмі, так і дарослымі.

Яшчэ зусім нядаўна сярод галоўных атрыбутаў яго была навагодняя віншавальная паштоўка. Сёння мы ўсё больш шлём электронныя віртуальныя пажаданні ды вывы, а мілая, ад рукі напісаная паштоўка амаль знікла з нашага побыту.



*Аднак рэтра-калекцыі паштовак выклікаюць з часам усё большую цікавасць, бо даўнія навагоднія малюнкі дазваляюць нам яскрава адчуць настрой.*












***Выкарыстаны выявы з агульнага доступу http://goodnewyear.ru/starye-retro-otkrytki-s-novym-godom

Самы вядомы «навагодні» мастак мінулага стагоддзя – Уладзімір Зарубін (1925–1996). Паштоўкі яго добра памятаюць тыя, каму крыху за 50, яны выдаваліся мільённымі тыражамі, куплялі іх з вялікім задавальненнем.

Пачынаў Уладзімір Зарубін як мастак кінастудыі «Саюзмультфільм». На яго рахунку 103 мультыплікацыйныя фільмы, сярод якіх «Ну, пачакай!», «Таямніца трэцяй планеты», «Жыў-быў пёс», часткова «Маўглі», «Брэменскія музыканты» і інш. Яго абаяльныя мядзведзі, зайцы, вавёркі, вожыкі на паштовых картках заваявалі сэрцы соцень тысяч людзей. Напэўна, таму, што кожная паштоўка – гэта маленькая казачная гісторыя, дзе персанажы дорацць адзін аднаму падарункі, катаюцца на лыжах, спяваюць, фатаграфуюцца, танцуюць, дурэюць – увогуле, жывуць. Працы Уладзіміра Зарубіна вельмі цэняцца калекцыянерамі: збор мастацкіх паштовак аўтарства У. І. Зарубіна нават выдзелены ў самастойную тэму ў філакартыі.






















Делегация ОО «Белорусский союз женщин» приняла участие в XXV Международной женской конференции «Восток и Запад встречаются в Петербурге». Этот симпозиум стал площадкой для обмена опытом в развитии глобального и цифрового мышления, идей женского бизнеса, социального предпринимательства, для создания региональных и международных гуманитарных контактов. На деловую встречу в Петербург приехали женщины-лидеры из 35 стран мира. Столь широкое представительство является подтверждением высокого интереса мирового сообщества к гендерной тематике. Председатель Белорусского союза женщин Марианна ЩЁТКИНА выступила с докладом «"Мягкая сила"»: женщины в современной политике».

Защита прав и улучшение положения женщин в обществе — один из важнейших приоритетов для Республики Беларусь. В нашей стране женщины составляют более 53% населения и более 50% занятых в экономике.

В основе гендерной политики Беларуси лежат общепризнанные международные нормы, а в Национ-

# Марианна Щёткина: «Сегодня женщины *ломают стереотипы*»

нальной стратегии устойчивого социально-экономического развития до 2030 года определено, что достижение гендерного равенства является одним из основных принципов устойчивого развития страны.

По Индексу гендерного равенства в отчёте Всемирного экономического форума за 2018 год Беларусь заняла 28-е место среди 149 стран мира. Этот высокий результат – следствие проводимой в стране последовательной гендерной политики. В Беларуси создан и успешно работает Национальный совет по гендерной политике, реализуется уже 5-й Национальный план действий по обеспечению гендерного равенства на 2017—2020 годы, принимаются комплексные меры по поддержке материнства и улучшению демографической политики.

Сегодня всё мировое сообщество активно включилось в работу по реализации «Повестки-2030» и закреплённых в ней 17-ти «Целей устойчивого развития», достижение которых будет способствовать экономическому, экологическому, социальному росту и повышению качества жизни людей. Международные эксперты отмечают: это не выбор, а необходимость, и это определяет дальнейшее развитие наших стран и планеты в целом.

Особое внимание Цели №5 — обеспечению гендерного равенства, потому что современная международная статистика о положении женщин пока не вызывает оптимизма.

**По информации структуры «ООН – женщины»:**

– на каждых 100 мужчин в возрасте 25–34 лет приходится 122 женщины, живущие в крайней нищете;
– женщины на 12% чаще, чем мужчины, страдают от продовольственной нестабильности;
– в 30% случаев неравенство в доходах обусловлено неравенством в семьях;
– женщины выполняют в 2,6 раза больше неоплачиваемых работ, в т. ч. домашних;
– разрыв в оплате труда на мировом рынке – 23%;
– в 18 странах мужья могут юридически помешать своим жёнам работать; в 39 странах дочери и сыновья не имеют равных прав наследования; в 49 странах отсутствуют законы, защищающие женщин от бытового насилия.



## Женщины в политике

Проведённые различными международными центрами и научными институтами исследования свидетельствуют: участие женщин в управлении на всех уровнях — это стабилизирующий фактор. Там, где женщины составляют 30-40% в структурах власти, общество развивается более стабильно, оно социально ориентированное. А вот государства, имеющие в своих парламентах и правительствах менее 25% женщин, с меньшей эффективностью справляются с проблемами охраны материнства и детства, прав ребёнка, социальной защиты.

Должна ли женщина заниматься политикой? Ответ на этот вопрос дала в 1791 г. в разгар Французской революции писательница Олимпия де Гуж: «Если женщина имеет право взойти на эшафот, она должна иметь право подняться на трибуну».

В политике, экономике, международной деятельности важно уметь договариваться, сотрудничать, уважать партнёра. Здесь востребованы такие качества, как гибкость, дипломатичность и ответственность. Женщины обладают всеми этими качествами, они способны добиваться желаемого на основе добровольного участия союзников, а не с помощью принуждения или подачек, и это есть, по определению политолога Джосефа Ная, «мягкая сила, которая формирует участие через привлекательность лидера». Это делает особенно важной роль женщин в укреплении мира, решении социально-экономических и гуманитарных проблем. Голос женщин должен звучать громче и требовательнее, и для этого необходимо, прежде всего, объединение усилий.

Республика Беларусь входит в число 27 государств мира, которые достигли целевого показателя по участию женщин в процессе принятия решений. Несмотря на отсутствие квотирования, в Беларуси обеспечено декларируемое международными документами 30-процентное представительство женщин на уровне принятия решений: сегодня среди руководителей 49 % — женщины. Количество женщин среди государственных служащих достигло 67,4%, в том числе на должностях руководителей организации и его заместителей — 56,2%. В Парламенте Республики Беларусь представительницы женского пола составляли более трети депутатского корпуса.

Сегодня совсем другой темп жизни, другое общество, и совсем другие женщины – они хотят заявить о себе и не боятся этого, они готовы упорно работать для того, чтобы наша жизнь становилась лучше, а страна процветала. Они стремятся реализовать себя не только в семейной жизни, но и в общественной, профессиональной сферах. На самом деле белорусские женщины имеют и права, и возможности. Но ещё существует ряд стереотипов, которые нам необходимо ломать, и наши женщины делают это.

ОО «Белорусский союз женщин» сегодня объединяет около 140 тысяч человек, это активные и инициативные люди, готовые быть полезными своей стране, готовые менять к лучшему жизнь на планете Земля.




# «Чараўніцы» – значыць прыгажуні

У гэтым годзе адзін з двух папулярных гёрлз-бэндаў СССР і першы ў Беларусі жаночы вакальна-інструментальны ансамбль «Чараўніцы» адсвяткаваў 45 гадоў са дня заснавання. Хто з нас не памятае трапяткія «Пах чабаровы», «Не за вочы чорныя» ці «Зачараваную»? Выпуск кружэлак на фірме «Мелодыя», Усесаюзны конкурс артыстаў эстрады ў 1979-м, Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Пхеньяне ў 1989-м, гастролі па ўсіх саюзных рэспубліках і паездкі ў Афганістан... Не жыццё, а мара! Але ў 1991-м калектыў распаўся, разам з Савецкім Саюзам. І раптам вярнуўся да жыцця ў 2011 годзе, з абноўленым складам, свежымі ідэямі і непаўторным «чараўніцкім» гучаннем, «як тады».

Гісторыя «Чараўніц» пачынаецца ў 1971 годзе. Былі часы неверагоднай папулярнасці ВІА, якія масава ствараліся ў той час ад Масквы да самых да ўскраін. Афіцыйна годам стварэння групы лічыцца жнівень 1974-га года, калі выпускніц Гродзенскай музвучэльні прынялі ў штат Белдзяржфілармоніі. Там, між іншым, ужо пяць гадоў як паспяхова існавалі «Песняры».

«Стваральнік» Генадзь Лятынскі адштурхоўваўся ад папулярнай на захадзе канцэпцыі гёрлз-бэнда – дзявочага гурта, які не проста спявае, але яшчэ і грае на інструментах. На музычным небасхіле Савецкага Саюза быў толькі адзін ВІА з цалкам жаночым складам, «канкурэнт» «Чараўніц» – «Дзяўчаты» Усяслава Лаўрова.

Але калі «Дзяўчаты» выкарыстоўвалі балалайку з акардэонам, то кіраўнік «Чараўніц» Лятынскі быў вялікім прыхільнікам джаза і джаз-

*«Стваральнік» Генадзь Лятынскі адштурхоўвайся ад папулярнай на захадзе канцэпцыі гёрлз-бэнда – дзявочага гурта, які не проста спявае, але яшчэ і грае на інструментах*



рока і аддаваў перавагу медным духавым – саксафонам, трамбону. Эстрадныя і народныя песні на беларускай мове ў джазавай аранжыроўцы набывалі сапраўды непаўторныя гучанне і каларыт. Менавіта гэтае гучанне дагэтуль застаецца візітнай карткай ансамбля.

– *Мы адрозніваліся тым, што з самага пачатку не толькі спявалі, але і гралі на інструментах,* – тлумачыць саксафаністка Святлана Рагула, якая прыйшла ў ансамбль у 1987 годзе. – *Прычым першы склад быў вялікі: тры саксафоны, флейта, трамбон, труба... Яўген Лятынскі даваў нам выконваць джазавыя інструментальныя кампазіцыі накшталт «Чыкага», ён прывучаў нас менавіта да такой музычнай манеры. Мы вучыліся на добрай музыцы, і гучанне «Чараўніц» у выніку станавілася арыгінальным – эстрадным, але з ухілам адначасова і ў джаз, і ў беларускую народную песню.*



*Сёння «Чараўніцы» – гэта музычная каманда, якая папаўняецца таленавітымі маладымі кадрамі. Вакалістка Анжаліка Зайцава з'явілася ў калектыве нядаўна: прайшла праз кастынг, які гурт абвясціў пасля таго, як Людміла Навумовіч вырашыла завяршыць кар'еру. Анжаліка – адзіная брунэтка ў ансамблі. А па-за ім яна – мама чацвярых дзяцей. Акрамя музыкі, захапляецца «кандытаркай», якой рэгулярна падмацоўвае сілы астатніх удзельніц. Піражкі, печыва, салодкія пернікі – усё смачнае і прыгожае!*







– Вольга Макушынская – наш працэсар, мега-мозг, яна вельмі адукаваны музыкант, прафесіянал найвышэйшага класа. У яе джазавая адукацыя, яна выкладае вакал ва Універсітэце культуры, яна робіць усе вакальныя аранжыроўкі, – расказвае салістка і, па сумяшчальніцтве, дырэктар ансамбля Паліна Базылёва (у калектыве яна з 2012-га – часу, калі толькі-толькі пачыналася вяртанне групы на беларускую сцэну). – Адрадзіць групу – гэта была, вядома, авантура чыстай вады. Але дзякуючы Вользе Макушынскай, Людміле Навумовіч, Святлане Рагула, Людміле Пахмурцавай усё атрымалася. Мы працягваем сябраваць з дзяўчатамі, якія завяршылі сцэнічную кар'еру. І на наш юбілейны канцэрт запрасілі і Надзею Мікуліч. Дарэчы, менавіта яна дала штуршок адраджэнню калектыву ў 2011 годзе. Прышлі на той канцэрт і іншыя ўдзельніцы ансамбля, якія ў розныя гады спявалі ў ім і гралі. Таму што былых «Чараўніц» не бывае!

Ад старога, яшчэ савецкага складу ў сённяшнім ансамблі толькі двое: музычны кіраўнік, вакалістка Вольга Макушынская і Святлана Рагула. Менавіта ў іх пераймае ўзровень сапраўдных «чараўніц» маладое папаўненне, якое прыйшло ў розныя гады.

– *Дзеці творчасці не перашкаджаюць!* – перакананая спявачка. – *Наадварот, яны пастаянна ездзяць з намі на канцэрты, старэйшыя ўжо на ўсю моц фатаграфуюць і здымаюць відэа, размаўляюць з нашымі прыхільнікамі ў сацыяльных сетках, падтрымліваючы кантакты з аўдыторыяй. Словам, гэта сапраўды наша будучыня.*

*«Чараўніц» сёння можна сустрэць на ўсіх пляцоўках краіны – ад раённых ДК да Белдзяржфілармоніі, ад невялікіх залаў да Палаца Рэспублікі. Прыходзяць да іх і яшчэ савецкія прыхільнікі ансамбля – панастальгіраваць, і моладзь, для якой ранейшыя і новыя, заўсёды па-асабліваму меладычныя песні – прыемная плынь ў патоку сучаснай музыкі.*





# ЧАРАЎНІЦЫ

Знайсці дзяўчат, якія граюць на духавых інструментах, – задачка не з простых. Ці шмат вы ведаеце, напрыклад, жанчын-трубачоў? У асноўным сярод дзяўчат-музыкантаў трапляюцца флейтысткі, радзей дамы асвойваюць кларнет. І ўжо зусім вялікая рэдкасць – сустрэць трамбаністку, бо інструмент гэты няпросты. Такі скарб – Наталлю Лукашэвіч – «чараўніцы» адшукалі некалькі гадоў таму на 4-м курсе Беларускага універсітэта культуры, калі літаральна шарсцілі ўсе ВНУ і музычныя вучэльні ў пошуках таленавітых дзяўчат-духавікоў. Зусім нядаўна да калектыву далучылася Дар'я Бабко – перспектыўная маладая саксафаністка, выпускніца кансерваторыі, лаўрэатка міжнародных конкурсаў і стыпендыятка Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Да яе, як з усмешкамі прызналіся «чараўніцы», прыглядаліся доўга. Па даволі празаічнай прычыне: усе ўдзельніцы калектыву высокія, а Даша – маленькая і далікатная.

*Сёння «Чараўніцы» – гэта музычная каманда, якая папаўняецца таленавітымі маладымі кадрамі*

Але... За «новую» былі такія аргументы, як несумненны талент і раскошныя, усім на зайздрасць, рудыя кучаравыя валасы: «На ІІ Еўрапейскіх гульнях, дзе мы давалі тры канцэрты, у нас было ўласнае Лісяня Лёсік!» – жартуюць дзяўчаты.

Для ансамбля пісалі найлепшыя беларускія кампазітары-песеннікі свайго часу: Ігар Лучанок, Юрый Семяняка, Яўген Глебаў, Уладзімір Мулявін, Эдуард Зарыцкі, Эдуард Ханок і Алег Елісеенкаў.

«Чараўніц» сёння можна сустрэць на ўсіх пляцоўках краіны – ад раённых ДК да Белдзяржфілармоніі, ад невялікіх залаў да Палаца Рэспублікі. Прыходзяць да іх і яшчэ савецкія прыхільнікі ансамбля – панастальгіраваць, і моладзь, для якой ранейшыя і новыя, заўсёды па-асабліваму меладычныя песні – прыемная плынь ў патоку сучаснай музыкі. Гэта не рэтра ці вінтаж, не: гэта крыху поп, трохі старога добрага лёгкадумнага джаза – з эстраднай пярчынкай і беларускім зместам. Гэта музыка, якая зачароўвае сваёй пяшчотай і чараўніцкім настроем.

**Ірына КАРЭНІНА**



Фота прадастаўлена PR-службай калектыва

# Жоўты «Мустанг» для Марыі

Тамара ВЯЦКАЯ
Фота: старонка vk.com/
Марыя ВАШКЕВІЧ

Я слухаю маю гераіню і ўвесь час думаю: «Вось тут трэба ўдакладніць, і гэта такса-ма...» Незнаёмых для мяне слоў і паняццяў шмат, што вельмі радуе, бо, калі ты думаеш, што ўжо ўсё ведаеш і ва ўсім разбіраешся, вось тут і з'яўляецца ў тваім жыцці такая Маша ВАШКЕВІЧ!

Мая гераіня Марыя родам з Магілёва, там скончыла школу, потым атрымала прафесію юрыста. Выбрала яе таму, што ёсць старэйшы брат, за ім Маша хвосцікам бегала ў дзяцінстве, удзельнічала ва ўсіх хлапечых вайнушках і забавах, вучыліся яны ў адной школе, і брат шмат чаго сястрычцы тлумачыў, дапамагаў з урокамі. Вось услед за ім Маша і юрыстам стала. А потым шляхі-дарогі разышліся: брат так і застаўся ў юрыспрудэнцыі, а Маша, трохі папрацаваўшы ў прыватнай фірме юрыстам, нешта засумавала. Думала: «Што, вось так і прасяджу з гэтымі сумнымі паперамі?» Дарэчы, каб скончыць лінію брата, адзначу: адносіны ў іх па-ранейшаму вельмі сяброўскія, дзяцей Машы брат песціць, ладзіць ім пастаянна «святы непаслушэнства» з забавамі, піцай і іншымі смакоткамі.





На ўсялякі выпадак, слоўнічак да нашай гутаркі:

**Контраварыйная падрыхтоўка** — сістэма навучання кіроўцаў транспартных сродкаў, якая выходзіць за межы звычайных ПДР і асноў кіравання аўтамабілем. Мэта гэтай сістэмы складаецца ў забеспячэнні бяспекі (зніжэнні рызыкі ДТЗ) шляхам папярэджання небяспечных сітуацый, насуперак неспрыяльным умовам і памылкам іншых удзельнікаў дарожнага руху. Змест контраварыйнай падрыхтоўкі максімальна прывязаны да рэальнага гарадскога ваджэння, усе контраварыйныя прыёмы дастасавальныя на дарогах агульнага карыстання, а навучанне павышае бяспеку кіравання.

**Экстрэмальнае кіраванне** — гэта «квазі-спорт», кіраванне аўтамабілем з выкарыстаннем прыёмаў гоншчыкаў-ралістаў ці блізкіх да іх. Прыёмы экстрэмальнага кіравання непрыдатныя на дарогах агульнага карыстання.

**Гоначны касцюм** павінен быць трывалым, лёгкім, зручным і не абмяжоўваць рухаў. Адна з галоўных умоў — гарачатрываласць. Паводле дзеючых патрабаванняў, «касцюм» пілота павінен супрацьстаяць адкрытаму полымю не менш за 12 секунд, каб, у выпадку пажару, гоншчык паспеў пакінуць аўтамабіль. Пальчаткі павінны перадаваць максімум інфармацыі ад органаў кіравання, ідэальна аблягаць руку. Шыюць пальчаткі з номекса з прасякнутымі ўстаўкамі са скуры і замшу.

**Трэк** — гэта кантактны від гонак, дзе дазволена сутыкацца адзін з адным.

**Мустанг** — культавы аўтамабіль класа «Pony Car» вытворчасці «Ford Motor Company». Першапачатковы варыянт 11233 (1964-1973 гг.) Быў створаны на базе агрэгатаў сямейнага седана «Ford Falcon» (Лі Якока і яго каманда). Першы серыйны «Mustang» сышоў з канвеера 9 сакавіка 1964 года як мадэль 1965-га. Гэта была адна з самых удалых прэм'ер у гісторыі аўтамабілебудавання. Аўтамабіль паскараецца з месца да 100 км/г за 5,8 секунды і максімальна разганяецца да 250 км/г.

**Дрыфт** — тэхніка праходжання завароткаў і від аўтаспорту, які характарызуецца выкарыстаннем кіраванага заносу на максімальна магчымых для ўтрымання на трасе хуткасці і вугла траекторыі. Спаборніцтвы праводзяцца на асфальце, лёдзе, трасах з вялікай колькасцю паваротаў.

**Корцен** — (яе яшчэ называюць картэнаўская сталь). Па сутнасці, гэта — лісты металу, пакрытага адмысловым саставам. Пасля ўстаноўкі панэль пачынае акісляцца і ржавее. З часам іржа ператвараецца ў плёнку, вонкавы від панэлі «кансервуецца», і далейшай карозіі металу не адбываецца.

**Рэбокс** прапаноўвае наборы прадуктаў з фотарэцептамі, па якіх любы чалавек зможа прыгатаваць дамашнюю вячэру як у рэстаране і на кожны вечар, і з асаблівай нагоды.

**Коргі** — пароды пастуховых сабак з Уэльса. Паводле адной з легенд, шчанюкоў людзям падарылі феі, у якіх парода выкарыстоўвалася ў якасці ездавых. Адносяцца да сямейства аўчарак, мініяцюрныя. Адданыя, любяць сям'ю свайго гаспадара. Яны лаяльна ставяцца да ўсіх людзей і іншых жывёл, лёгка ўжываюцца з катамі.



Маша, пакуль была ў дэкрэце, вывучылася на псіхолага, але канкурыраваць з іншымі псіхолагамі, якіх цяпер шмат, не ўмела і не жадала, таму вырашыла заняцца чымсьці іншым. А паколькі любоў да тэхнікі ў дзяўчынкі з вясковага дзяцінства ў бабулі летам, а бацька навучыў яе вадзіць машыну гадоў у дванаццаць, то пайшла Марыя абнавіць веды па ваджэнні на контраварыйныя курсы. І, як той казаў, прапала...

Цяпер яна — адна з лепшых інструктараў на курсах Сяргея Аўчыннікава. Ну і што, што жанчына? Гэта дадае ёй, між іншым, ачкоў, таму што Маша, як і муж яе Павел, — класная аўтагоншчыца. Яна памятае ўсіх сваіх курсантаў па імёнах, шукае падыход да кожнага, вучыць быць уважлівымі да сябе і свайго стану і думае, ці не напісаць кнігу-дапаможнік пра тое, як ездзіць акуратна, без гвалту на дарозе. І яна ўпэўненая, што вадзіць машыну можа кожны, калі ўжо толькі не татальна невідушчы або з вялікімі псіхічнымі адхіленнямі.









Дарэчы, Маша ніколі не думала, што стане гоншчыцай, таму што яна пра гэта ведала, але як бы з боку, як бы нават і не марыла. Гоншчыкі — гэта было залімітава. А потым выявілася, што ўсё побач, блізка і магчыма, і, як кажа Марыя, тут яна «аслупянела». Тады ж зрабіла сабе татУ, таму што стала свабоднай, стала дарослай, стала разумець, што можа кіраваць і сваім целам, і сваім жыццём так, як ёй хочацца.

Машына і гараж для Машы — сімвалы свабоды і сваёй асабістай прасторы, асабістага свету, які толькі твой: «Я з усіх сіл спрабую мяняць свет гвалту на дарогах. Пакуль у нас на дарогах няма месца старым, маленькім машынкам, вадзіцелям-пачаткоўцам. Але пакрысе людзі прывыкаюць». У Машы ёсць машына для трэкавых гонак з дрыфту «Рамонак» — гэта «Жыгулёнак-2».









Чаму сям'я Вашкевічаў два гады таму пераехала ў Астрашыцкі Гарадок? Ім патрэбна была прастора! І месца для рэалізацыі задум ва ўсім. Таму што Маша і Павел — аўтагоншчыкі. Ім трэба шмат месца для машын. І патрэбна свежае паветра, і камфортныя ўмовы для трох дзяцей. Дом сваёй мары яны збудавалі з нуля, дзе ўвасобілі практычна ўсе дызайнерскія задумкі, як, напрыклад, картэнаўская абшыўка дома. Або сцяна са старых цаглін з печы. Ці графіці ўздоўж усёй лесвіцы ў гараж, а пад другой лесвіцай — дзіцячая гульнявая пляцоўка. Цяпер яны будуюць яшчэ адзін гараж, а лазня ў іх атрымалася сама сабой. Я паказвала б іх дом на экскурсіях за грошы, таму што там няма глянцу і гламуру, няма ідэальнай чысціні, але ёсць утульнасць, стыль і абсалютны камфорт.

Матыватар жыцця ў Машы вельмі просты: «Калі ёсць людзі, якія жывуць, дзе хочуць і як хочуць, і ездзяць на такіх машынах, на якіх хочуць, то чаму гэта не мы?»

Дарэчы, рыхтаваць ежу Маша не асабліва любіць: лічыць, што гэта марнаванне часу! Дзяцей, нагадаю, трое: Адаму 13 гадоў, Ядвізе 11 гадоў, а маленькаму Севасцьяну — 2. Сілкуюцца старэйшыя ў школе, а дома ў іх, па словах Машы, кулінарныя курсы: «Я купляю наборы рэбокс, і дзеці па рэцэптах усё самі робяць, вучацца гатаваць, і ежа атрымліваецца рэстаранная, свежая. Я магу арганізаваць, каб ежа была дома, але паўдня марнаваць на прыгатаванне не магу. Няма сэнсу! Мужчыну ў сучасным свеце таксама мамкі-нянькі не патрэбныя. Яму патрэбны таварыш, з якім клёва праводзіць час, з якім важна падзяліцца эмоцыямі і радасцю. Муж яшчэ і ганарыцца мной у мужчынскай кампаніі — ён усюды мяне бярэ з сабой, я не сяджу дома на пятых ролях. Мне важна, каб мой мужчына мяне не саромеўся і не баяўся, чаго я там у сецціве панапісваю...»

Гоначны спецыяльны касцюм быў пашыты для Марыі па яе мерках ў Гомелі. Яна спантанная, крэатыўная, фантануе ідэямі, а муж Павел усе гэтыя яе ідэі ўвасабляе ў жыццё.

На сёння ў яе ёсць чарговая ідэя: купіць машыну «Мустанг», вялікай сям'і яна патрэбна для камфортнага жыцця. Гэтая машына, як Маша лічыць, «не для пантоў, а для кахання, і мы ідзём пацціху да гэтай мэты». Колер Маша хоча ярка-жоўты — сонечны. Думаю, што ёй, вельмі прыгожай дзяўчыне, такі колер будзе дужа пасаваць да твару.



# Чем опасны «невинные хлопушки»?

Ну какие новогодние праздники без бенгальских огней, фейерверков и петард!? Эта ночь всегда проходит громко и сопровождается яркими салютами.
Случаи, когда невинная забава становится причиной серьёзных травм, также происходят довольно часто. А потому медики советуют, прежде всего, внимательно изучать инструкцию, которая должна быть на каждом пиротехническом изделии.

Пользоваться новогодней пиротехникой нужно очень осторожно, а от петард подпольного китайского производства можно получить опасную травму. Помните, что продажа праздничной пиротехники разрешена только ограниченное количество дней в году и в строго определённых местах. Петарды не должны продавать несовершеннолетним. Кроме того, вся пиротехника обязана продаваться с инструкцией по технике безопасности на упаковке и быть сертифицирована.

Есть и другая беда – самодельная пиротехника, а также использование сигнальных и осветительных ракет военного производства. Тут уже любые правила безопасности бессильны. От подобных суррогатов в новогоднюю ночь следует решительно отказаться!

### Самые важные пункты инструкции, обратите на них внимание:

1. Не поджигать пиротехнику, держа её в руках. Никогда не зажимать подожжённые петарды или ракеты в кулаке.
2. Не накрывать петарды различными сосудами и не помещать их внутрь сосудов (бутылок, банок и т. п.).
3. Не взрывать петарды в непосредственной близости от человека и не направлять ракеты в сторону людей.

### ПОМНИТЕ!

**При несчастном случае следует ВСЕГДА вызывать скорую медицинскую помощь.**

**Если вы встречаете праздник вне населённого пункта и планируете взрывать «хлопушки», ОБЯЗАТЕЛЬНО изучите, как оказывать доврачебную помощь пострадавшему от пиротехники. Важно не растеряться!**

Самой частой травмой, получаемой при использовании петард, хлопушек и бенгальских огней, являются **термические ожоги**. Дети острее взрослых испытывают тягу к ярким ощущениям и поэтому чаще взрослых страдают от неправильного использования пиротехники. В случае ожогов у детей всегда следует вызывать врача, так как очень сложно определить прогноз и дальнейшее развитие, на первый взгляд, совершенно безобидных ожоговых изменений – со временем пораженная поверхность из-за анатомо-функциональных особенностей детской кожи может увеличиться по сравнению с первоначальной даже вдвое!

Самое эффективное средство при любых ожогах – это немедленное охлаждение обожжённой поверхности холодной водой, снегом, льдом или любым замороженным продуктом из холодильника (желательно, в упаковке). После этого обожжённое место обрабатывается в соответствии со степенью ожога. Лёгкие ожоги следует смочить бледно-розовым раствором марганцовки. Если площадь ожога большая, надо наложить противоожоговую мазь или обработать аэрозолем.

### Помощь ребёнку с ожогами высокой степени до прихода врача или до приезда в клинику состоит в следующем:

- *обильное поливание участков поражённой кожи холодной водой;*
- *аккуратное освобождение поверхности ожога от одежды;*
- *наложение на рану влажной стерильной повязки с антисептиком.*

Наносить на область тяжёлого термического ожога мази, пасты, кремы, порошки и т. п. не рекомендуется. Также следует отметить, что поверхностные ожоги, как правило, сопровождается образованием волдырей – тонкую плёнку волдыря нельзя срывать ни в коем случае!

**Другая опасность при неосторожном обращении с праздничной пиротехникой – различные травмы глаз**: световое поражение сетчатки, ожог век и проникающие ранения осколками инородных предметов. При поражении органов зрения следует тампоном охладить обожжённый участок кожи и сразу же вызвать скорую помощь! Самолечение недопустимо.

По информации ГУ «Минский областной центр гигиены, эпидемиологии и общественного здоровья»

# «Чалавек створаны з любові і зорнага пылу...»

Анхела Эспіноса Руіз нарадзілася на поўдні Іспаніі, у Малазе, адным з найстаражытнейшых гарадоў Еўропы. Горад універсітэтаў і мастакоў — з Малагі паходзіць Пабла Пікаса. Таленавітая дзяўчына палюбіла мову далёкай краіны Беларусі — ды так, што стала пісаць на ёй вершы і назвала яе мовай свайго сэрца.

Анхела скончыла аддзяленне славянскай філалогіі ў Гранадскім універсітэце, курс беларускай філалогіі — у Варшаўскім, дзе абараніла магістарскую працу па паэзіі Міхася Стральцова. Пераклала на беларускую мову вершы Максіма Багдановіча і Янкі Купалы. А сёлета ў верасні абараніла доктарскую дысертацыю па беларускай літаратуры ў Мадрыдскім універсітэце «Камплутэнсэ». Дарэчы, гэта першая ў Іспаніі абарона дысертацыі па беларускай літаратуры. Аўтарка трох кніг на беларускай мове, у свае 26 гадоў Анхела паспела зрабіць так многа.

**– Анхела, у Малазе «*марскі брыз лашчыць дзявочыя валасы, а сонца цалуе пяткі*» – тут і далей цытую вашу кнігу «*Колер крылаў*», якая выйшла ў 2019 годзе ў Мінску. Што б вы хацелі дадаць да партрэта сваёй спакойнай радзімы?**

– Малага – прыгожы і ўтульны горад з высокай якасцю жыцця. Але не надта спакотны, асабліва калі ўлічыць, што ён знаходзіцца блізка да Афрыкі, усяго каля 25 кіламетраў морам. Звычайна ўлетку бывае каля 27–28 градусаў, зрэдку даходзіць да 40. З аднаго боку ў нас знаходзіцца



Гутарыла Алена БРАВА.
Фота з асабістага архіва Анхелы ЭСПІНОСЫ РУІЗ

Міжземнае мора, з другога – горы. За апошнія 10-15 гадоў горад актыўна развіваўся ў плане культуры, паўстала шмат новых музеяў. Мясцовыя ўлады дбаюць пра тое, каб Малага была не толькі курортам.

**– Як даўно вывучаеце беларускую мову?**

– Вырашыла сур'ёзна заняцца гэтым у 2012 годзе, апынуўшыся ў Варшаве, у асяродку беларускамоўных літаратараў, журналістаў, людзей культуры. Амаль цэлы год шукала патрэбныя матэрыялы, знайсці іх было нялёгка. Такім чынам, мову вывучаю амаль 7 гадоў.






**– «*Я дзіўнаваты чалавечак са светла-сумнай песняй на душы. Люблю чытаць на самоце з кубкам гарачай гарбаты ўзімку і глядзець на знічкі ўлетку. Я поўная энергіі тады, калі пішу свае радкі і хаджу па беразе мора. Люблю горкі шакалад, марозіва і кнігі...*» Далей вы прызнаяцеся ў любові да беларускай мовы: «*душа супадае менавіта з ёю*». Да слова, «*светла-сумная песня*» ў беларускіх паэтаў-класікаў мінулага гучыць даволі часта. І ў вашых вершах такі настрой адчуваецца...**

– У мяне такі характар – меланхалічны, хоць людзі кажуць, што я часта смяюся, што вясёлая. Так што «светлы сум» у маіх вершах гучыць як у гармоніі з беларускай літаратурнай традыцыяй, так і асобна ад яе. Беларуская літаратура дапамагла мне знайсці сябе яшчэ раз, бліжэй пазнаёміцца з гэтай сваёй часткай – светла-меланхалічнай. Вершы я пішу з шасці гадоў, нізка ў той час выйшла ў дзіцячай рубрыцы адной з газет Малагі. Не думала, што буду літаратаркай. І калі пачала складаць вершы па-беларуску, рабіла гэта для свайго задавальнення і каб лепш вывучыць мову. Напачатку не хацела нават аддаваць іх у друк. Цяпер, атрымаўшы шмат водгукаў, больш не баюся публікавацца, выступаць з вершамі, хоць часам і сумняюся ў сабе – самакрытычнаць мне ўласцівая.

**– Кажуць, чым больш моў ведаеш, тым лягчэй вывучыць наступныя. Ці гэта праўда? Колькі моў вы ведаеце цяпер і якія?**

– Залежыць ад таго, як разумець слова «ведаць». Я строга падыходжу да сябе, таму сказала б, што ведаю іспанскую, англійскую, беларускую мовы, але для большасці людзей гэта не будзе адпавядаць рэчаіснасці. Два гады я пражыла ў Польшчы і свабодна размаўляю па-польску. Да таго ж, мовы немагчыма ведаць пастаянна на аднолькавым узроўні. Калі няма практыкі, мова забываецца. Пра тое, што кожная наступная мова вучыцца лягчэй – праўда, але частковая. Ёсць навык, ён з часам паляпшаецца. Але... вось я цяпер вывучаю японскую. Гэта цяжэй, чым авалодаць чарговай славянскай мовай.

**– Вы выдалі тры кніжкі і напісалі некалькі навуковых даследаванняў па-беларуску, перакладаеце на іспанскую нашых класікаў. Ці змяніла вас у чымсьці ваша беларускасць?**

– Беларускую мову я пачала вывучаць, калі мне было каля 20 гадоў, зараз мне 26. Перыяд, які моцна ўплывае на жыццё і самасвядомасць чалавека. З'яўляюцца новыя сябры, фарміруецца светапогляд, таму цяжка сказаць, на што паўплывала менавіта беларушчына. Але мне дакладна адкрылася новае грамадства – уся беларускамоўная Беларусь раптам стала даступнай. І гэта, безумоўна, паўплывала на мяне, – магчыма, у тым, што я адчула больш упэўненасці ў сабе, стала больш энергічна адстойваць свае погляды.






**– «*Светла-сумная песня на душы*» гучала і ў Максіма Багдановіча, творы якога вы пераклалі на іспанскую. Зборнік «*Згукі маёй бацькаўшчыны*» выйшаў у Мадрыдзе. Чым прывабіла вас творчасць Багдановіча?**

– Багдановіч – цудоўны паэт і, безумоўна, адзін з маіх улюбёных у беларускай і сусветнай літаратуры, але прычына, чаму я выбрала яго, даволі звычайная. У Беларусі хапае добрых літаратараў – і ў мінулым, і сучаснікаў, хапае добрых твораў – класічных і наватарскіх. Я яшчэ жыла ў Варшаве, калі да мяне звярнуліся з аднаго невялікага мадрыдскага выдавецтва, якім кіруе сямейная пара: жонка родам з Беларусі, муж – іспанец. Яны захацелі выдаць кагосьці з беларускіх творцаў, але прыўрочыць выданне да нейкай даты, звязанай з аўтарам. Ішоў 2016 год, і я падумала, што ў 2017-м якраз будзе 100 год, як няма Максіма Багдановіча. Вось нагода перакласці яго вершы і зрабіць кнігу. Мне і раней падабаліся творы Багдановіча. Працуючы над кнігай, яшчэ больш палюбіла Максіма. Перакладаць яго на іспанскую мову аказалася лёгка. Вершы добра гучаць, файна ўпісваюцца ў традыцыю іспанамоўнага вершаскладання. Выданне атрымала падтрымку беларускай амбасады. Кніга была прэзентаваная ў Мадрыдзе, на імпрэзе пабывалі міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей і Павал Латушка, які на той час быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Францыі. Пабывалі прадстаўнікі беларускай дыяспары, іспанскія аматары паэзіі. Да слова, гэта першая асобная кніжка перакладаў вершаў Багдановіча на іспанскую мову.







*“Мае бацькі заўсёды паўтаралі нам з братам: “Дзеці, у жыцці вы можаце стаць, кім толькі захочаце. Не бойцеся марыць”*

**– Прыемна, што вашы бацькі далі вам, як і брату, моцны пасыл да незалежнасці, да скарэння прафесійных і творчых вяршынь. Прыклад таго, чаго можа дасягнуць дзяўчынка, выхаваная без стэрэатыпаў. А як вы самі лічыце?**

– У мяне дзяцей няма і не плануецца, але мая думка на гэты конт такая. Трэба добра пазнаёміцца са сваімі дзецьмі, бо дзіця – гэта не частка бацькоў, не «працяг» іх, а асобная істота. Калі дзіця пачынае выяўляць характар, свае інтарэсы, трэба іх падтрымаць. Гэта складана, бо ў маці і бацькі часта ёсць свае ўяўленні пра тое, што дзіцяці мусіць падабацца: футбол ці лялькі. І калі тыя ўяўленні не знаходзяць падтрымкі ў сына ці дачкі, бацькі часам пачуваюцца расчараванымі. Я думаю, вельмі шкада, калі ў чалавека ёсць талент, але няма магчымасці гэты талент раскрыць толькі праз чыесьці ўяўленні, скіраваныя ў той ці іншы бок.

Што да майго дзяцінства, у мяне быў даволі нейтральны інтарэс – кнігі, бацькі мне чытаць не перашкаджалі. Яшчэ заахвочвалі да музыкі, я скончыла музычную школу, граю на фартэпіяна. Настаўнікі часам лічылі, што бацькі прымушаюць мяне займацца музыкай і шмат чытаць, але такое было маё сапраўднае жаданне.

*“Любы чалавек створаны з любові і зорнага пылу…”*

– Бацькі далі нам з братам… грэцкія імёны... Маё імя, Анхела, мае значэнне «пасыльная».

**– Не так даўно давялося прачытаць: адна з вашых місій як літаратаркі – у тым ліку і прысароміць нас, беларусаў, за тое, што мала размаўляем на роднай мове. Ці згодныя вы з такім разуменнем свайго «паслання»?**

– Не лічу, што ў літаратуры абавязкова павінна быць нейкая місія, акрамя мастацкай, – сацыяльная ці палітычная. З іншага боку, я разумею сітуацыю з беларускай мовай, і мне было б прыемна, калі б мае творы дапамагалі беларусам выправіць яе. Але найперш мне хацелася б, каб мае вершы разглядаліся менавіта ў рэчышчы іх мастацкай вартасці.






*«Я люблю чытаць класічную літаратуру, граць на піяніна, пісаць вершы і паводзіць сябе як чалавек XIX стагоддзя з жаночымі роўнымі правамі і з Інтэрнэтам»*

## Анхела Эспіноса Руіз

***

Ты стаіш на парозе між явай і сном,
Ты стаіш чалавекам, анёлам, пачварай,
Ты стаіш абгалелы пад бледным
святлом,
Не сыходзь — я хачу цалаваць твае
шнары...
Я стаю на каленях, цалую зямлю,
Тваёй скуры хацела б стаць знакам
радзімым,
Ледзьве бачу цябе, у адчаі стаю:
Тваё цела ўзнімаецца ранішнім дымам.
Ты стаіш — за табою сівая любоў,
Ты стаіш перад безданню страху й
пяшчоты,
Ты стаіш, свае рукі падняў —
ты гатоў
Да абдымкаў, распяцця,
ці ўсё ж —
да палёту.

***

Хай знойдуцца там і сям
Апіскі, памылкі друку,
Вяртаюся, як у храм,
Да вобразаў і да гукаў,
Да літар лячу, бы ўздых,
Да цёплых, жывых старонак,
Няхай і на кожнай з іх
Банальнасць і забабоны,
Хай месцамі рытм не той,
Ды рыфма крыху крывая,
Ты – верш улюбёны мой:
Цябе я штоноч чытаю.
Чытаю твае радкі
На вечна замежнай мове,
Хай не змагу ўсё ж такі
Злавіць сэнс кожнага слова,
Бо строфы твае – пра нас,
Я ўсё ж не губляю веры:
Чытаю цябе штораз
Абдымкамі на паперы.

2019.



**– Вы носіце незвычайны кулон – выяву кропкі з коскай. За гэтым сімвалам стаіць нешта асаблівае для вас?**

– Напачатку гэты знак сімвалізаваў для мяне толькі любоў да моў, граматыкі, літаратуры. Кропка з коскай – рэдка ўжывальны, «дыскрымінаваны» знак, таму я адчула да яго пэўную пяшчоту. У маёй кніжцы «Раяль ля мора», якая выйшла ў 2015 годзе, ёсць верлібр, прысвечаны гэтаму знаку. Потым я даведалася, што кропка з коскай сімвалізуе змаганне з дэпрэсіяй, псіхічнай нестабільнасцю. Людзі, якія рабілі спробы самагубства альбо сутыкнуліся з жыццёвым выпрабаваннем і выстаялі, робяць тату ў выглядзе гэтага знака. Бо кропка з коскай – вялікая паўза, але не канец. Файна, што кулон, які я нашу, набыў такое значэнне, таксама мне блізкае. У творчага чалавека душэўныя крызісы здараюцца ўдвая часцей. Не толькі праз тонкую натуру, але і таму, што творчае асяроддзе вельмі таксічнае ў любой краіне. У мастацтве вялікая канкурэнцыя, гонкі за прызы, перамогі. Кропка з коскай як бы сведчыць: працяг будзе.

**– «Я часцей за ўсё пачуваюся ў гэтым свеце як іншапланецянка...» Што вы мелі на ўвазе?**

– Ёсць шмат фактараў, праз якія я так пачуваюся, адзін з іх, магчыма, мая інтраверсія. Іспанія краіна для экстравертаў. Тут незнаёмыя могуць звярнуцца да цябе з размовамі ў чарзе ці на прыпынку. Іспанцы размаўляюць, як на мяне, занадта гучна. Але справа не толькі ў інтраверсіі. Я заўсёды мела ўражанне, што паміж мною і іншымі нябачная сцяна. У юнацтве было складана стасавацца з аднагодкамі глыбей, чым «прывітанне», «да пабачэння». Цяпер мая «іншасць» не такая заўважная. У мяне ёсць сябры, павага людзей, але базавыя складанасці не зніклі. Я маю здольнасці да хуткага вывучэння моў, складання вершаў, граю на піяніна – перавагі маёй натуры, а вось заводзіць сяброў мне цяжэй, чым сярэднестатыстычнаму чалавеку.

У маленстве быў такі выпадак. Я навучылася чытаць у 2,5 гады, у 3 гады пайшла ў прадшколу (пачатковая школа ў Іспаніі). У мяне былі любімыя кнігі, і я марыла падзяліцца імі з дзецьмі. Але ніхто, акрамя мяне, не ўмеў чытаць! Там была вялікая бібліятэка, і на перапынку, калі іншыя дзеці пайшлі гуляць, я засталася сярод кніг. «Што ты робіш тут адна, Анхела?!» – занепакоілася настаўніца. Я адказала, што не адна, бо тут столькі кніг. Тая здзівілася: маўляў, ты адказваеш, як філосаф, а не як трохгадовае дзіця.

**– А калі вы пачуваецеся шчаслівай?**

– Шчасце – матылёк, яго немагчыма злавіць, каб трымаць увесь час пры сабе, ён памірае ў зняволенні. Шчасце здараецца з табой на нейкія імгненні, перыяды жыцця. Яго цяжка заўважаць, лягчэй зрабіць гэта, паглядзеўшы назад. Калі ты не гонішся за шчасцем, матылёк проста прылятае і сядае табе на плячо...



# Знайдзіся, дзіця!



**Вольга СІМАКОВІЧ**,
дырэктар ДУА «Дзіцячы дом №5 г. Мінска»:

– Наша ўстанова адукацыі разлічана на 75 дзяцей, у цяперашні час тут выхоўваецца 60. Пераважна гэта падлеткі. Як правіла, у інтэрнатных установах пражывае больш хлопчыкаў – дзяўчатак часцей забіраюць у сем'і. Не выключэнне і наш дзіцячы дом: у нас 21 дзяўчынка і 39 хлопчыкаў.

Дзяржава прыкладае шмат намаганняў, каб дзеці жылі з роднымі людзьмі. Але не заўсёды гэта ўдаецца. Свая трагічная гісторыя ёсць у кожнага дзіцяці, якое засталося без апекі бацькоў. Для мяне і персаналу кожны з нашых выхаванцаў – асоба, каштоўная і ўнікальная.

Наколькі важнае сямейнае ўладкаванне для дзіцяці? Не проста важнае, а неабходнае. Ролю папячыцеля для нашых хлопчыкаў і дзяўчатак, якія засталіся без бацькоўскага клопату, узяла на сябе дзяржава, аднак дзяржава ўсё ж не мама і не тата. Дзіця мае патрэбу ў індывідуальным клопаце і ўвазе. Як бы мы, калектыў установы, ні стараліся, мы не ў стане стварыць для кожнага выхаванца хатнюю ўтульнасць, камерную, інтымную абстаноўку, як гэта робяць блізкія людзі дома.

Дзяржаўная ўстанова, на жаль, не можа ўзнавіць вобраз бацькоўскай сям'і, прадэманстраваць яе мадэль. Бо ў сям'і дзіця бачыць, напрыклад, як мама і тата гатуюць ежу, плацяць за кватэру, плануюць сямейны бюджэт альбо адпачываюць. Выпускніку інтэрнатнай установы складана арыентавацца ў знешнім свеце менавіта праз тое, што ён такіх узораў паводзін не мае.

## У кожнага сіраты свая трагічная гісторыя

Дзецям патрэбна ласка, блізкі кантакт з любячым дарослым. І хоць нашы педагогі працуюць па клічы сэрца, а я заўсёды кажу дзецям: «У нас адна вялікая сям'я, гэта твой дом», – тым не менш, дзіцяці ў інтэрнаце цяжка адчуць сябе любімым і патрэбным. Дом, дзе ў хлопчыка ці дзяўчынкі 59 братоў і сясцёр, моцна адрозніваецца ад дома, дзе ён ці яна будзе другім, трэцім, пятым, нават дзясятым. Такі дом мы замяніць не можам.

Але, вядома, стараемся даць дзецям усё магчымае, каб яны не адчувалі сябе ўшчэмленымі. Вельмі шмат сіл у развіццё і падтрыманне дзіцячага дома на высокім узроўні ўклала папярэдні яго дырэктар, Тамара Мікалаеўна Лаўрухіна, якая кіравала ўстановай шэсць гадоў. Неабыякавыя людзі прапаноўваюць нам сваю дапамогу. Дзякуючы ім, нашым партнёрам, мы з дзецьмі пастаянна наведваем спартыўныя святы, культурныя мерапрыемствы, дабрачынныя вечары. Арганізацыі, якія займаюцца з падлеткамі, праводзяць у нас пасяджэнні гурткоў і спартыўных секцый, нашы выхаванцы маюць магчымасць бясплатна займацца многімі відамі спорту. Напрыклад, з намі супрацоўнічае баскетбольны клуб «Цмокі-Мінск», клубы па тайскім боксе, Палац барацьбы імя Аляксандра Мядзведзя, фізкультурна-спартыўны Цэнтр дзяцей і моладзі Фрунзенскага раёна г. Мінска. Нават тыя трэніроўкі, якія для хатняга дзіцяці каштуюць грошай, нашым рабятам і дзяўчаткам прапануюцца бясплатна. Дзеці маюць магчымасць наведваць заняткі па вольнай барацьбе, самба, баскетболе, валейболе, футболе, скалалазанні. Наша спартыўная зала добра ўкамплектаваная, ёсць футбольнае поле. Арганізуюцца розныя гурткі па інтарэсах, дастаткова гульняў і кніг.

*Дом наш вялікі ды ўтульны, 57 яго супрацоўнікаў шчыра любяць дзяцей і ствараюць максімальна камфортныя ўмовы для іх пражывання, вучобы і адпачынку. Але гэта не заменіць дзіцяці мацярынскага і бацькоўскага цяпла.*



## Таццяна

Таццяна – акуратная, цярплівая, уседлівая і дапытлівая. Захапляецца галаваломкамі і матэматыкай, старанна асвойвае камп'ютар, можа сканцэнтравацца на цікавым заданні і давесці яго да канца. Актыўна рухацца Таня таксама любіць: пластычная і музыкальная, займаецца ў танцавальным і гімнастычным гуртках. А яшчэ дзяўчынка ахвотна гуляе з малодшымі дзецьмі. Тактоўная і ўраўнаважаная, працоўныя даручэнні выконвае якасна і з жаданнем.

На сённяшні дзень у Таццяны ёсць праблемы з мовай, ёй патрэбна лагапедычная дапамога. І, вядома, ласка і клопат. Педагогаў-жанчын, да якіх асабліва прывязаная, Таня называе «мамамі». А «матулі», у сваю чаргу, імкнуцца акружыць яе і ўсіх хлопцаў і дзяўчатак у інтэрнаце душэўным цяплом і любоўю.

